# НЯСТОМНАЯ РУПЛІВІЦА НА НІВЕ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ І АДУКАЦЫІ

У нас яшчэ будзе час на зваротны шлях,
а пакуль
мы няспешна ідзём ад вусця да вытоку,
да крыніцы,
да жыватворнай крынічкі…
Усё чысцей робіцца вада ў рацэ.

*Мікола Сянкевіч*



Жыватворнай крыніцай на філалагічным факультэце нашага ўніверсітэта з'яўляецца руплівая, штодзённая праца прафесара, доктара філалагічных навук Зоі Пятроўны Мельнікавай, якая асвятляе шлях у навуку і натхняе сваіх вучняў і студэнтаў на дасягненне новых вяршынь. 25 верасня Зоя Пятроўна адзначыла свой 70-гадовы юбілей.

Нарадзілася Зоя Пятроўна ў сялянскай сям'і ў вёсцы Навасёлкі Докшыцкага раёна на Віцебшчыне. Змалку бацькі выхоўвалі ў дачкі любоў да працы, павагу да людзей, традыцыйныя каштоўнасці. У сям'і шанавалі працу настаўніка, менавіта бацькі дапамаглі дачцэ вызначыцца з будучай прафесіяй.

У 1969 г. яна паступіла ў Полацкае педагагічнае вучылішча імя Францыска Скарыны, якое паспяхова скончыла ў 1973 г. Педагагічную дзейнасць пачынала з працы піянерважатай, потым працавала выхавальніцай у дзіцячым садку, настаўніцай пачатковых класаў. Прага да вучобы, самаўдасканалення прывяла маладую настаўніцу на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Пасля заканчэння ўніверсітэта выпускніца паступіла ў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларускай ССР. Настаўнікамі аспіранткі Зоі Мельнікавай былі Алесь Адамовіч, Іван Навуменка, Уладзімір Гніламёдаў, Васіль Жураўлёў, Міхась Мушынскі, Адам Мальдзіс, Алесь Яскевіч, якіх і сёння Зоя Пятроўна ўспамінае з павагай, цеплынёй і ўдзячнасцю.

У 1986 г. у Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук Беларускай ССР З. П. Мельнікава абараніла кандыдацкую дысертацыю «Творчасць З. Бядулі і станаўленне лірычнай плыні ў дакастрычніцкай беларускай літаратуры». Гэта быў толькі пачатак яе шляху ў навуку. Абаяльная, таленавітая даследчыца па-свойму, з новых аксіялагічных падыходаў асэнсоўвае беларускую класіку, а таксама аналізуе творчасць сучасных пісьменнікаў. У фокусе навуковай зацікаўленасці Зоі Пятроўны – праблемы гісторыі літаратурнага працэсу, сучаснай беларускай літаратуры, тэорыі і метадалогіі літаратуразнаўства. Руплівa даследуе Зоя Пятроўна творчасць З. Бядулі, Я. Купалы, М. Гарэцкага, У. Караткевіча, В. Быкава, Р. Барадуліна і многіх іншых мастакоў слова.

Плёнам навуковай дзейнасці Зоі Пятроўны Мельнікавай стала абарона ў 2004 г. доктарскай дысертацыі, прысвечанай праблемам метадалогіі беларускага літаратуразнаўства («Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства і творчасць Змітрака Бядулі 20 – 30-х гадоў»), публікацыя больш за 200 навуковых прац, сярод якіх манаграфіі, дапаможнікі, падручнікі для агульнаадукацыйных школ, навукова-метадычныя выданні з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: манаграфія

«На горне душы: творчасць З. Бядулі і беларуская літаратура першай трэці XX ст.» (2001), манаграфія «Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства» (2003), курс лекцый «Метадалогія літаратуразнаўства» (2011), манаграфія «Беларуская літаратура і нацыякультурная прастора» (2014), дапаможнік «Псіхалогія літаратурнай творчасці» (2017).

Прафесар Зоя Пятроўна Мельнікава – аўтарытэтны літаратуразнаўца не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Яна мае публікацыі ў рэспубліканскіх энцыклапедычных выданнях, аўтарытэтных літаратуразнаўчых выданнях Беларусі і блізкага замежжа, спецыялізаваных зборніках, часопісах, выступае ў друку на старонках рэспубліканскіх і абласных перыядычных выданняў.

Зоя Пятроўна Мельнікава рэгулярна выступае з дакладамі на рэспубліканскіх і міжнародных навуковых форумах, з'яўляецца членам Савета па абароне кандыдацкіх, доктарскіх дысертацый па спецыяльнасці «Журналістыка» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта; яна член рэдакцыйных калегій літаратурна-мастацкага і грамадска-палітычнага часопіса «Полымя» і навукова-тэарэтычнага часопіса «Веснік Брэсцкага ўніверсітэта». На працягу некалькіх гадоў Зоя Пятроўна ўдзельнічае ў распрацоўцы дзвюх навуковых тэм, якія ўваходзяць у План важнейшых навукова-даследчых прац Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ў галіне прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных і сацыяльных навук у межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Беларуская мова і літаратура».

У 2008 г. Зоя Пятроўна Мельнікава ўзначаліла аўтарскі калектыў, у які ўваходзілі і выкладчыкі кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна, па стварэнні вучэбных дапаможнікаў па беларускай літаратуры для 11-гадовай агульнаадукацыйнай школы, які стаў пераможцам у рэспубліканскім конкурсе «Беларускі падручнік». У аснову гэтых выданняў была пакладзена новая канцэпцыя выкладання беларускай літаратуры ў школе. Па падручніках «Беларуская літаратура. 10 клас» і «Беларуская літаратура. 11 клас», створаных аўтарскім калектывам пад кіраўніцтвам З. П. Мельнікавай, сёння вывучаюць родную літаратуру ўсе старшакласнікі краіны.

Зоя Пятроўна Мельнікава паспяхова кіруе навуковай школай па вывучэнні беларускага гісторыка-функцыянальнага літаратуразнаўства. За апошнія 10 гадоў пад яе кіраўніцтвам абаранілі кандыдацкія дысертацыі Людміла Міхайлаўна Садко, Вольга Мікалаеўна Кавальчук, Вольга Аляксандраўна Буднік, Антон Станіслававіч Папоў, Святлана Мікалаеўна Тарасава.

Старэйшы настаўнік мудра накіроўвае сваіх вучняў-калег у навуковую прастору, вядзе за сабой, паказваючы прыклад руплівай працы. Пад рэдакцыяй прафесара Зоі Пятроўны Мельнікавай надрукавана калектыўная манаграфія «Беларуская проза XX–XXI стагоддзяў: героі, паэтыка, аксіялогія», суаўтарамі якой з'яўляюцца прадстаўнікі яе навуковай школы.

За час амаль саракагадовай працы Зоя Пятроўна была загадчыкам кафедры, дэканам філалагічнага факультэта, зараз працуе прафесарам на кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі. Студэнты, выпускнікі філалагічнага факультэта, настаўнікі Брэстчыны ведаюць Зою Пятроўну як высокапрафесійнага і добразычлівага выкладчыка, які глыбока валодае метадалогіяй філалагічных навуковых даследаванняў і творча выкарыстоўвае ў выкладчыцкай і арганізацыйна-выхаваўчай працы сучасныя адукацыйныя тэхналогіі.

Вучні, калегі, студэнты – усе мы шчыра віншуем Зою Пятроўну з юбілеем і жадаем моцнага здароўя, новых дасягненняў у навуцы, творчых поспехаў у працы, невычэрпнай энергіі і натхнення!

*Кафедра беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі*